# РУХ за свабоду

Бюлетэнь ПАГА "Рух "За Свабоду". Выпуск № 8 верасень 2011



**"Канстытуцыйны суд не хоча працаваць" – с.2**

**Апазіцыя: рэабілітацыя або смерць – с.4-6**

**Падвышэнне пенсійнага ўзросту: ці трэба і калі? – с.7**

**Мінскі Еўраклуб адкрыў бібліятэку – с.8**


# Назад – у 18 снежня

**Заняпад у эканоміцы, пагроза сацыяльнага выбуху і ціск з боку Масквы змусілі-такі беларускія ўлады падаць больш выразны дыялогавы сігнал на Захад. Лукашэнка прапанаваў апазіцыі круглы стол, а ў кулуарных перамовах паабяцаў еўрапейцам неўзабаве вызваліць палітзняволеных. Але цешыцца зарана, бо існуе вялікая небяспека, што дыялог будзе зімітаваны выключна дзеля атрымання крэдытаў і інвестыцый.**



Аляксандр Лукашэнка прапанаваў "усім людзям цвярозага розуму, якія любяць сваю краіну, да якога б палітычнага лагера яны ні належылі, сесці за круглы стол, паглядзець адзін аднаму ў вочы і рэальна ацаніць, хто чаго варты і што можа зрабіць для эфектыўнага паляпшэння сітуацыі ў краіне". Гэта было 29 жніўня.

А 1 верасня ён памілаваў яшчэ чатырох асуджаных удзельнікаў падзей 19 снежня 2010 года ў Мінску. Сярод вызваленых – Алесь Кіркевіч, Андрэй Пратасеня, Алег Гнедчык і Дзмітрый Даронін. Прэзідэнцкая прэс-служба паведаміла: "Адпаведны ўказ кіраўнік дзяржавы падпісаў пасля разгляду прашэнняў гэтых грамадзян аб памілаванні. Асуджаныя заявілі аб раскаянні, прызнанні віны, усведамленні супрацьпраўнага характару сваіх дзеянняў і аб гатоўнасці ў далейшым строга выконваць заканадаўства Рэспублікі Беларусь".

Раней Лукашэнка памілаваў дзевяць удзельнікаў падзей у дзень прэзідэнцкіх выбараў. Нагадаем, гэта – Зміцер Дрозд, Арцём Грыбкоў, Сяргей Казакоў, Яўген Сакрэт, Уладзімір Яроменак, Васіль Парфянкоў, Віталь Мацукевіч і Аляксандр Кляткевіч. А супраць шэрагу апазіцыянераў былі спыненыя крымінальныя справы.

Дарэчы, актывісту Руху "За Свабоду" Мікіту Ліхавіду, як паведаміла ягоная адвакатка Дар'я Ліпікна, пісаць прашэнне аб памілаванні нават не прапаноўвалася. Пасля шэрагу змяшчэнняў у штрафны ізалятар хлопца, які называе сябе незаконна асуджаным і адмаўляецца выконваць некаторыя патрабаванні ўнутранага распарадку Наваполацкай калоні №10, перавялі ў памяшканне камернага тыпу.

Памілаваны Андрэй Пратасеня менавіта Мікіту Ліхавіда назваў сапраўдным героем, якім ён захапляецца і які адкрыта супрацьстаіць сістэме нават у зняволенні.

2 верасня высветлілася, што 26 жніўня Лукашэнка правёў сакрэтныя перамовы з міністрам замежных справаў Балгарыі **Мікалаем Младэнавым**.

Па выніках гэтай сустрэчы Младэнаў накіраваў ліст вярхоўнаму прадстаўніку ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі Кэтрын Эштан і кіраўнікам знешнепалітычных ведамстваў краін ЕС з інфармацыяй, што Лукашэнка паабяцаў вызваліць чатырох палітзняволеных да канца мінулага тыдня (што і адбылося). Усіх астатніх палітзняволеных кіраўнік Беларусі паабяцаў вызваліць у пачатку кастрычніка.

Балгарскі міністр таксама праінфармаваў Эштан, што Лукашэнка паабяцаў правесці круглы стол з апазіцыяй для абмеркавання будучыні краіны, на які будзе запрошаная "група мудрацоў" для назірання і садзеяння перамовам.

На прэс-канферэнцыі ў Сафіі 2 верасня Младэнаў адзначыў: "*Думаю, што для ўсіх у ЕС важна, каб у Беларусі, якая мяжуе з ЕС, пачаўся рэальны дыялог, каб былі пачатыя рэальныя рэформы, вялося рэальнае супрацоўніцтва паміж уладай і апазіцыяй, каб краіна рухалася па шляху дэмакратызацыі і павагі да дэмакратычных каштоўнасцяў*".

Сітуацыя па Беларусі была абмеркаваная 3 верасня на нефармальнай сустрэчы міністраў замежных спраў краін ЕС у польскім Сопаце. Па выніках было заяўлена, што ЕС прыняў да ўвагі апошнія заявы і дзеянні беларускага кіраўніцтва, але працягвае настойваць на вызваленні ўсіх палітзняволеных і зняцці з іх абвінавачанняў.

**Працяг на с.3**

# “Канстытуцыйны суд не хоча працаваць”

**Фармальны характар існавання гэтай установы ў Беларусі чарговы раз пацвярджае адказ, дасланы адтуль на запыт Руху “За Свабоду” наконт абмежавання свабоды перамяшчэння.**



KC.GOV.BY

Гаворка пра пастанову Савета міністраў ад 10 чэрвеня 2011 года № 753 “Пра некаторыя пытанні рэгулявання вывазу аўтамабільнага паліва з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь”, якая на думку юрыстаў Руху, парушае права грамадзян на свабоду перамяшчэння.

Рух “За Свабоду” ў сваім звароце прапанаваў Канстытуцыйнаму суду даследаваць згаданую пастанову на прадмет яе адпаведнасці Канстытуцыі і міжнародным дамовам, а таксама выступіць з ініцыятывай удасканальвання заканадаўства па пытанні вывазу аўтамабільнага паліва.

Нагадаем, згодна з пастановай, кожны, хто перасякае мяжу на аўтамабілі болей за адзін раз цягам пяці сутак, не мае права вывозіць аўтамабільнае паліва нават у баку свайго аўтамабіля. Бо яно, паводле чэрвеньскага рашэння ўраду, не можа лічыцца таварам для ўласнага карыстання і мусіць абкладацца мытай. Працэдура вывазу паліва ў гэтым выпадку не выпрацаваная, што фактычна абмяжоўвае права на выезд грамадзян за мяжу ўласным транспартам.

Такое становішча супярэчыць артыкулу 30 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (права грамадзян свабодна пакідаць краіну і вяртацца ў яе), артыкулу 12 Міжнароднага пакту пра грамадзянскія і палітычныя правы (права на свабоднае перамяшчэнне і выбар месца жыхарства) і нават трохбаковым дамовам у межах Мытнага звязу Беларусі, Казахстана і Расіі, згодна з якім паліва ў баку аўтамабіля з’яўляецца таварам для асабістага карыстання і не абкладаецца мытамі.

– *Сітуацыя склалася пасля вядомых пратэстаў перавозчыкаў паліва ў Брузгах. Пастанова была прынятая з мэтай абмежавання незаконнага вывазу паліва за мяжу. Але дакумент не вырашыў праблемы. Па-першае, парадак дэкларавання паліва ў баку ўласнага аўто не акрэслены, па-другое, пастанова распаўсюдзілася на ўсіх грамадзян, у тым ліку добрасумленных аўтааматараў, якія сутыкаюцца з немагчымасцю рэалізацыя канстытуцыйнага права на свабоду перамяшчэння,* – каментуе сітуацыю праваабаронца, юрыст Руху **Андрэй Сушко**.

У адказе з Канстытуцыйнага суда на ліст за подпісам Аляксандра Мілінкевіча, у якім уздымалася пытанне адпаведнасці Канстытуцыі гэтай урадавай пастановы гаворыцца, што праверка канстытуцыйнасці нарматыўна-прававых актаў праводзіцца на падставе звароту ўпаўнаважаных дзяржаўных органаў і службовых асобаў – прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Палаты прадстаўнікоў, Савета Рэспублікі, Вярхоўнага суда, Вышэйшага гаспадарчага суда і Савета міністраў.

На думку праўнікаў Канстытуцыйнага суда, у звароце Руху “За Свабоду” ставіцца пытанне не пра выпраўленне юрыдычных прабелаў, калізій і прававой невызначанасці, адносна якіх КС можа самастойна ўносіць прапановы, а менавіта пра адпаведнасць Канстытуцыі і міжнародным актам пастановы ўраду пра абмежаванне вывазу паліва за межы Мытнага звязу. У гэтым выпадку КС, маўляў, можа дзейнічаць, толькі калі разгляд пытання ініцыюецца ўпаўнаважанымі на тое пералічанымі вышэй дзяржаўнымі структурамі. Менавіта да гэтых органаў, якія маюць права ўнясення прапановаў у КС, мусяць звяртацца грамадзяне, каб ініцыяваць праверку канстытуцыйнасці пастановы.

− *У адпаведнасці з заканадаўствам, Канстытуцыйны суд мог прыняць зварот Руху “За Свабоду”, разгледзіць яго і, у сваю чаргу, узняць пытанне пра незаконнасць пастановы, але яны прыдумалі фармальны адказ, каб не займацца пытаннем абмежавання канстытуцыйнага права грамадзян на свабоду перамяшчэння. Мы да гэтай пары стаім на пазіцыях, што пастанова Саўміна не адпавядае Канстытуцыі, а таксама здароваму сэнсу, і будзем займацца гэтай справай надалей, у тым ліку выкарыстаем усе заканадаўчыя механізмы, каб Канстытуцыйны суд усё ж такі заняўся тым, за што яго супрацоўнікі атрымліваюць заробак,* − пракаментаваў Андрэй Сушко.

Дарэчы, грамадзяне, якія пацярпелі ад абмежаванняў на выезд, уведзеных пастановай Саўміна ад 10 чэрвеня гэтага года, могуць звяртацца ў офіс арганізацыі па кансультацыі і юрыдычную дапамогу. Юрысты дапамогуць скласці індывідуальныя скаргі альбо звароты ў адпаведныя структуры.

# Назад – у 18 снежня (працяг)

Пачатак на с.1

Чаму вызваленне палітвязняў мусіць быць перадумовай для перамоваў, а не адной з тэмаў падчас іх? Пазіцыя Руху "За Свабоду" з вуснаў **Аляксандра Мілінкевіча** такая:

"*Проста гэтае пытанне не патрабуе дыскусій. Што абмяркоўваць? Спіс каго трэба выпусціць, а каго – не? Вызваленне вязняў сумлення павінна засведчыць рэальнае жаданне ўладаў распачаць перамены і весці дзеля гэтага канкрэтны дыялог, інакш існуе вялікая верагоднасць, што гэта ўсяго толькі гандаль і палітычны тэатр. Гэтая перадумова – своеасаблівая лакмусавая паперка. Нарэшце, не забываемся пра палітычна-маральны чыннік. Лукашэнка кажа пра чалавечую гаворку, але наўрад ці гэткай можна назваць гаворку паміж паліцэйскім і чалавекам за кратамі. Сітуацыю для больш-менш справядлівага фармата круглага стала трэба абнуліць да падзеяў 19 снежня мінулага года*".

> "Сітуацыю трэба абнуліць да падзеяў 19 снежня мінулага года"

Першасныя ж тэмы ўжо падчас уласна перамоваў – вольныя выбары і доступ да СМІ.

Як зрабіць так, каб круглы стол, перамовы не сталіся імітацыяй дыялогу, загульваннем і зацягваннем часу для атрымання нейкіх выгод ад Захаду?

Калі ўлада сапраўды жадае распачаць грамадскі дыялог у краіне, то яна не павінна вызначаць тое, хто ад дэмсупольнасці будзе ўдзельнічаць у магчымым круглым стале. Мы самі мусім гэта зрабіць. Магчыма, правесці дзеля гэтага Кангрэс дэмсілаў, дзе, апрача вызначэння прадстаўніцтва, таксама зацвердзіць па павестцы дня, умовах, рэгламенце.

Наколькі заявы Лукашэнкі скіраваныя не толькі на Захад, але і на беларускі народ, які незадаволены сітуацыяй у эканоміцы? Лукашэнка ж разумее, што ён мусіць казаць нешта новае. У тым ліку, каб запабегнуць вулічных хваляванняў. А з іншага боку, без вулічнай дэмакратыі перамовы з пазіцыі сілы будзе весці менавіта Лукашэнка…

"*Мэтавай групай гэтай заявы ёсць і беларускае грамадства, і Захад, – кажа старшыня Руху. – Не выключаю, што і падзеі ў Лівіі маглі адыграць тут значную ролю. Выдатна, калі на вуліцы за плячыма апазіцыі стаяць сотні тысячаў грамадзянаў. Пакуль гэтага спрыяльнага фактара няма, але спіраль незадавальнення хутка раскручваецца. Галоўным рухавіком пераменаў у Беларусі становіцца эканоміка. Мы мусім выкарыстаць гэты момант і распрацаваць усе разам – і палітыкі, і грамадскія лідары, і журналісты, і эксперты – супольную стратэгію і супольную пазіцыю для круглага стала*".

Дарэчы, такая ініцыятыва ад Руху "За Свабоду" прагучала на адмысловых кансультацыях лідараў апазіцыі. І была прынятая. Цяпер рыхтуецца адмысловая сустрэча з удзелам лідараў "трэцяга сектара", экспертаў і журналістаў.

Пазіцыя Руху: дэмакратычныя сілы мусяць выступіць з добра прапрацаваных і ўзгодненых пазіцый.

> "Галоўным рухавіком пераменаў у Беларусі становіцца эканоміка."

Калі, натуральна, меркаваны круглы стол адбудзецца – і адбудзецца не ў фарсавым фармаце. Бо каментары, што прагучалі наўздагон заявам Лукашэнкі на Першым канале і АНТ, прымушаюць ставіцца да яго словаў мінімум стрымана.

"*Напэўна, прэзідэнт, агучваючы сваю ідэю, меў на ўвазе наступнае:збірайцеся левыя, правыя, непрымірымыя, прыхільнікі, выпрацоўвайце прапановы нават без удзелу ўлады і ўносьце іх. Калі прапанова вартая, то ні адна нармалёвая ўлада, якая адчувае праблемы ў эканоміцы або фінансах, не можа яе ігнараваць, паколькі для ўлады яна выгадная*", – патлумачыў мэседж Лукашэнкі кіраўнік АНТ **Рыгор Кісель**.

А аглядальнік БТ **Юрый Пракопаў** наогул заявіў, што "*апазіцыянеры чамусьці прынялі гэтую прапанову на свой рахунак» і «пачалі займаць табурэткі і дыктаваць ўмовы*", адзначыўшы, што ў краіне мноства партый і грамадскіх арганізацый. Апазіцыя была названая "*недамоваздольнай*". Па словах Пракопава, улады клічуць на дыялог "*адказныя палітычныя сілы*", а не "*агентаў замежных цэнтраў*", "*пагромшчыкаў*" і тых, хто "*дамагаўся ў дачыненні да Беларусі эканамічных санкцый*".




Гэты надпіс з'явіўся 12 жніўня на сцяне былой ДАКі, блізу Наваполацкай калоніі, дзе адбывае пакаранне актывіст Руху "За Свабоду"



# Аляксандр Мілінкевіч
# Апазіцыя: рэабілітацыя або смерць

**Беларуская апазіцыя шмат гадоў усё прадказвала то гарачую вясну, то гарачую восень, але яны аніяк не надыходзілі. Рэжым усё трымаўся і выжываў. Лукашэнка дэманстраваў вялікія здольнасці тактыка і заставаўся аніякім стратэгам: мы так і не даведаліся, куды ён вёў краіну.**

Але зараз ужо для большасці беларусаў відавочна: мы прыйшлі ў нікуды. Дзяржава ў глыбокім сістэмным крызісе, аўтарытарная мадэль не працуе без замежных датацыяў, яна безнадзейна састарэла. Тэрмінова патрэбныя грунтоўныя структурныя пераўтварэнні. Калі кіраўнік улады кажа, што нічога мяняць не трэба, гэта толькі значыць, што негатыўныя працэсы бліжэйшым часам набудуць большую дынаміку.

## Сцэнары

Для рэжыму застаюцца тры асноўныя сцэнары развіцця падзеяў.

Першы – Лукашэнка прадае Маскве лепшае, што ёсць у эканоміцы. Атрымлівае грошы ад прыватызацыі і маскоўскія крэдыты, часова вырашае сацыяльна-эканамічныя праблемы. Беларусь паступова становіцца правінцыяй Расіі з фармальным суверэнітэтам і "кіраванай дэмакратыяй" на чале з "генерал-губернатарам".

Другі сцэнар – самаізаляцыя краіны і ўзмацненне дыктатуры. "Кубанізацыя" Беларусі, хутчэй за ўсё, праз увядзенне ваеннага становішча з далейшым пошукам вонкавых і ўнутраных ворагаў. Малаверагодны варыянт, бо мы не на востраве жывем.

*Рэформы каштуюць дорага, і Еўразвяз – фактычна адзіны рэальны партнёр у іх паспяховым правядзенні.*

І трэці сцэнар – рэжым вызваляе палітвязняў, аднаўляе дыялог з Захадам, праводзіць эканамічную і палітычную лібералізацыю, адбываецца паступовы дэмантаж дыктатуры. Рэформы каштуюць дорага, і Еўразвяз – фактычна адзіны рэальны партнёр у іх паспяховым правядзенні.

Першы сцэнар – гэта шлях да страты незалежнасці, другі – да дэградацыі і, магчыма, да рэвалюцыі, трэці – эвалюцыйнае вяртанне да еўрапейскай цывілізацыі.

## Масква і новая Берлінская сцяна

Хто можа лічыцца сёння сур'ёзным гульцом у беларускіх справах?

Мы ўсе – і народ, і апазіцыя, і рэжым – прайгралі на снежаньскіх выбарах. Прайгралі на пэўны час шанец на еўрапейскі шлях.

Ва ўладзе 19 снежня відавочна перамаглі прыхільнікі рэпрэсіяў і татальнага кантролю над грамадствам.

Дэмакратычныя дзяржавы пасля нашай мінулай прэзідэнцкай кампаніі фактычна згубілі рэальны ўплыў на ўнутраную сітуацыю ў Беларусі. Паміж маёй Гародняй і Беластокам сёння – новая Берлінская сцяна.

Апошнія нашы выбары амаль на 100% выйграла Масква, для якой важна пакінуць нашу краіну ў сферы свайго дамінуючага ўплыву. І яна атрымала сёння эканамічныя, палітычныя, інфармацыйныя, сацыяльныя, дыпламатычныя інструменты для таго, каб не пусціць Беларусь у Еўропу.

Аднак ёсць падставы і для аптымізму – гэта значны рост

праеўрапейскіх настрояў насельніцтва за першую палову гэтага года. Галоўнымі акторамі ў рэшце рэштаў заўсёды становяцца грамадзяне. І ўсё больш беларусаў выступаюць за хуткія рынкавыя і дэмакратычныя рэформы. Таму галоўнае – не Крэмль, Вашынгтон і Брусель, а працэсы, што адбываюцца ў грамадскай думцы.

Апазіцыя з 2007 года знаходзіцца ў перманентным крызісе, і сведчанне таму – 9 незалежных кандыдатаў у прэзідэнты, у выніку паходу якіх на выбары з 9 стратэгіямі дэмакратычная супольнасць апынулася разгромленая, а незалежнасць – пад крытычнай пагрозай.

## Лукашэнка – не прычына, а наступства

Дэмакратычныя сілы зараз падзеленыя.

Не столькі па ідэалогіях, колькі па поглядах на наш геапалітычны выбар і па пытанні “хто вінаваты”.

Частка дэмакратаў, з большага левыя, прапануюць інтэгравацца з Расіяй і сябраваць з Еўропай. Правыя – за інтэграцыю з Еўразвязам і добрасуседства з Масквой. Першыя кажуць: “Куды нам без Расійскай федэрацыі, калі і ў Еўропу, то толькі з ёй, або з яе дазволу”, а іх апаненты ўпэўненыя: “Толькі ў аб’яднанай Еўропе мы захаваем незалежнасць, будзем мець сучасную эканоміку, дабрабыт і адраджэнне нацыі”.

Гэта, без сумневу, дыяметральна розныя пазіцыі па стратэгіі развіцця Беларусі. Такой сімпатычнай нам Швейцарыяй мы не будзем, бо нарадзіліся не ў Альпах, а на мяжы цывілізацыяў. Прыйдзецца рабіць выбар, на сёння не столькі выбар далучэння да моцных, колькі выбар каштоўнасцяў, што вызначаць будучыню беларусаў.

Ёсць падзел і па вызначэнні прычынаў крызіснага стану краіны, і па метадах змагання за свабоду.

Меншасць апазіцыі лічыць галоўнай нашай бядой Лукашэнку і гатовая дзейнічаць па прынцыпе: “Чым горш, тым лепш”. Дзеля змагання за дэмакратыю яны гатовыя ўдарыць па рэжыме татальнымі эканамічнымі санкцыямі, нават прапануюць увесці расійскія танкі.

> *“Любіце Беларусь болей, чым вы ненавідзіце Лукашэнку”*

На шчасце, бальшыня дэмакратычнай супольнасці разумее, што Лукашэнка – не прычына, а наступства, наступства постсавецкага мыслення. І мы жывем у “апошняй дыктатуры Еўропы”, бо дыктатура сядзіць у галовах людзей, там замала дэмакратыі і нацыянальнай свядомасці. Для гэтай часткі апазіцыі важна, каб пад абломкамі рэжыму не загінула нашая дзяржава. Яны прапануюць замяніць спрошчанае “абы не было Лукашэнкі” на дзяржаўніцкае “перш за ўсё – Беларусь”. І раяць: “Любіце Беларусь болей, чым вы ненавідзіце Лукашэнку”.

## Закансерваваны рэйтынг

Галоўнае, што мусяць зрабіць апазіцыйныя сілы, – гэта вярнуць сабе статус суб’екта палітыкі. Сёння адчуваецца значнае расчараванне беларускай апазіцыяй і ў краіне, і ў вачах заходніх дэмакратыяў. На апошніх выбарах людзі пастаянна казалі: “Вы тут усё нас пераконваеце, што Лукашэнка кепскі. Так мы і самі тое ведаем. А вось скажыце, чаму пры вас жыццё стане лепшым?”. Без зразумелага адказу на гэтае пытанне мы можам не выйграць і сумленныя выбары.

Начальнік краіны стала губляе падтрымку і ўжо не верне яе, а апазіцыя мае і сёння свае дзесьці 30%, – як і ў 2001, і ў 2006 гадах. Не пераймаем згубленых рэжымам беларусаў. Яны разумна хочуць не толькі ламаць, але і будаваць. Нам трэба пераканаць іх, што мы – стваральнікі. Патрэбны станоўчы імідж, неабходна зразумелае бачанне будучыні дзяржавы.

Апазіцыя не ў стане сёння аб’яднацца на чале з адзіным лідарам.

Але яна абавязана гаварыць адным голасам адносна дыктатуры, мець адзіную тактыку барацьбы за свабоду. Палітычныя і грамадскія лідары, журналісцкая і экспертная супольнасці ўсе разам мусім выпрацаваць стратэгію магчымага круглага стала з уладай у пераходны перыяд. Сёння ён нерэальны, але сітуацыя непрадказальная і вельмі дынамічная. Мусім быць гатовыя, калі хочам быць у рэальнай палітыцы. Для старой апазіцыі такія крокі – адзіны шлях да рэабілітацыі. Адным словам – рэабілітацыя або смерць.

> *Апазіцыя абавязана гаварыць адным голасам адносна дыктатуры, мець адзіную тактыку барацьбы за свабоду*

Што тычыцца Захаду, то ягоная палітыка адносна Беларусі павінна быць маральнай, жорсткай і двухузроўневай: асобна – адносна рэжыму, асобна – для грамадства. Для вызвалення палітвязняў трэба паслядоўна выкарыстоўваць палітычныя, персанальныя, дыпламатычныя санкцыі. Эканамічныя – толькі кропкавыя, бо яны б’юць болей за ўсё па простых людзях, памяншаюць праеўрапейскія настроі, дапамагаюць прапагандзе стварыць з апазіцыі вобраз унутранага ворага. Сёння відавочна, што адмова Еўразвязу ад ўвядзення шырокіх эканамічных санкцый была дальнабачным рашэннем: уся адказнасць за стан гаспадаркі і фінансаў зараз справядліва ляжыць на Лукашэнку, а не на Захадзе. ЕЗ і ЗША не павінны верыць ніякім дэкларацыям афіцыйнага Мінска, а толькі канкрэтным дзеянням.

Працяг на с.6

# Рэабілітацыя або смерць

Працяг са с. 4-5

Далейшае супрацоўніцтва павінна адбывацца паводле дарожнай мапы: крок за крок; няма чарговага кроку па лібералізацыі – няма дапамогі.

*Супрацоўніцтва павінна адбывацца паводле дарожнай мапы: крок за крок; няма чарговага кроку па лібералізацыі – няма дапамогі.*

Краіна шукае адказы на вечныя пытанні – “хто вінаваты?” і “што рабіць?”

Вера ў цуды “жывей за ўсіх жывых”. Многім і ў грамадстве, і ў апазіцыі здаецца, што вось не будзе Лукашэнкі – і адразу станем жыць, як у аб’яднанай Еўропе. Дыктатура, без сумневаў, павінна зысці. Але нам трэба пазбаўляцца ілюзіяў і разумець, што прайсці трансфармацыю звычайна складаней, чым здабыць свабоду.

## Выбары “пасля”

Мы не маем права, змагаючыся сёння за вольную краіну, не думаць пра Беларусь “пасля”. Гэта будзе час нашай вялікай адказнасці, адказнасці нацыянальна-дэмакратычнай эліты.

Лукашэнка не можа прайграць ніякія “свае” выбары, дзе не лічацца галасы, а пішуцца працэнты. Ён напэўна зыйдзе па-іншаму: у выніку сацыяльнага выбуху, эканамічнага крызісу, натуральнага ці спраўакаванага, змовы атачэння, або з іншых прычынаў. Ягоныя абавязкі будзе выконваць прэм’ер-міністр, які мусіць аб’явіць першыя новыя выбары кіраўніка дзяржавы пасля дыктатуры. Яны могуць стаць вырашальнымі для будучыні Беларусі і напэўна пройдуць па дэмакратычных правілах. Гэтага запатрабуе народ, у гэтым будуць зацікаўленыя і Захад, і Расія.

Новы прэзідэнт атрымае ўладу паводле лукашэнкаўскай Канстытуцыі, з абсалютна імператарскімі паўнамоцтвамі.

Ён можа распачаць будаўніцтва беларускай еўрапейскай вольнай Беларусі, адмовіцца ад бязмежнай улады на карысць парламента, Рады міністраў, мясцовага самакіравання, даць свабоду медыям, знішчыць татальны страх у грамадстве. Але можа і захаваць аўтарытарнае заканадаўства, у знак ўдзячнасці за падтрымку з Усходу можа быць абавязаны ўвесці расійскі рубель, у дадатак да мытнага заключыць ваенны і эканамічны саюзы з Масквой.

Таму гэтыя выбары “пасля” мы не маем права прайграць, і рыхтавацца да іх мусім ужо сёння. Сітуацыя будзе няпростай. Апазіцыя напэўна не будзе аб’яднанай і расколецца па геапалітычных сімпатыях. Наменклатура, якая будзе сур’ёзнай сілай, таксама, хутчэй за ўсё, падзеліцца. Адна частка будзе зацікаўлена захаваць свае пасады і бізнесы і выступіць супраць прыходу расійскіх алігархаў. Другая, што робіць вялікія грошы на Ўсходзе, можа згуляць у маскоўскім сцэнары. Цалкам не выключана ў такім выпадку кааліцыя нацыянальных дэмакратаў з прабеларускай наменклатурай, як і саюз прарасійскіх апазіцыйных і ўладных сілаў.



## Правы цэнтр

Але вырашальнымі будуць настроі грамадства. Мы абавязаны сур’ёзна і стала працаваць над узмацненнем дэмакратычных праеўрапейскіх поглядаў у краіне ўжо сёння. Важна, каб яны былі не толькі інтуітыўнымі, а глыбока абгрунтаванымі, устойлівымі. Нам спатрэбіцца эфектыўная спачатку шырокая правацэнтрысцкая кааліцыя, а потым на яе базе – парламенцкая партыя правага цэнтру, якая будзе адстойваць еўрапейскі беларускі выбар, каштоўнасці, спрыяць нацыянальнаму Адраджэнню і сталенню.

Рух “За Свабоду” мае амбітную задачу стаць цэнтрам яднання праеўрапейскіх прабеларускіх сіл, і ўжо сёння вядзе працу над адукацыйнымі і інфармацыйнымі кампаніямі, якія маюць спрыяць нашаму вяртанню ў еўрапейскую сям’ю: “Народная праграма”, Еўрапейскія клубы, Еўрапейскі народны ўніверсітэт, Рада еўрапейскай інтэграцыі. Нашы задачы – узбудзіць у грамадстве дыскусію аб бачанні будучай Беларусі, паглыбіць веды пра гісторыю, перавагі і выклікі еўраінтэграцыі, дасягненні і памылкі рэформаў новых чальцоў ЕЗ, весці падрыхтоўку будучай рэгіянальнай уладнай эліты, распрацоўваць дарожныя мапы беларускіх рэформаў разам з экспертамі Славакіі, Эстоніі, Польшчы і іншых краінаў-суседзяў. Мы хочам дагрукацца да маладых дынамічных патрыётаў Беларусі, якім і выпадзе будаваць яе “пасля”.

*Рух “За Свабоду” мае амбітную задачу стаць цэнтрам яднання праеўрапейскіх прабеларускіх сіл*

Еўрапейская будучыня Беларусі павінна ствараць ужо сёння.

# Падвышэнне пенсійнага ўзросту: ці трэба і калі?

**Услед заканадаўчым ініцыятывам па падвышэнні пенсійнага ўзросту ў Еўропе ў краінах СНД таксама сур'ёзна задумаліся наконт гэтай праблемы. Ва Ўкраіне да 2014 года плануецца павялічыць пенсійны ўзрост для жанчын. Дыскусія адбылася і ў Расіі. Напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі з падобнай ініцыятывай выступіла Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.**

Аднак, ці актуальна гэта для нас? І што вымушае дзяржаву прымаць такое непапулярнае рашэнне, як павелічэнне пенсійнага ўзросту?

Асноўная прычына – гэта старэнне насельніцтва. Дзякуючы павелічэнню ўзроўня жыцця, людзі пачалі жыць даўжэй, таму і колькасць пенсіянераў прыкметна ўзрасла. Такім чынам, узнікае шэраг праблем: недахоп сродкаў у пенсійным фондзе, недастатковая колькасць месцаў у дамах догляду за пажылымі людзьмі, значная нагрузка на сістэму аховы здароўя і г.д. Неабходна ўлічваць, што ў любой сістэме налічэння пенсій яе памер узрастае пры павелічэнні працоўнага стажу.

Акрамя таго, існуюць і менш актуальныя, аднак важныя для пажылых людзей праблемы. Людзі пенсійнага ўзросту могуць быць цалкам працаздольнымі, аднак яны вымушаныя развітвацца з любімай працай менавіта з-за жорсткага заканадаўства ў гэтым пытанні. У выніку многія пажылыя людзі адчуваюць сябе непатрэбнымі грамадству, не ведаюць чым заняцца. Менавіта таму ў Германіі даволі актыўна дыскутуецца пытанне скасавання пенсійнага ўзросту.

Асноўная матывацыя тых, хто выступае супраць пенсійнай рэформы ў еўрапейскіх краінах, палягае ў тым, што падвышэнне пенсійнага ўзросту – гэта пагроза росту беспрацоўя сярод моладзі. Сапраўды, калі пенсійны ўзрост павялічваецца, колькасць працоўных месцаў істотна скарачаецца, паколькі пажылыя людзі працуюць даўжэй. Разам з тым



PHOTO.BYMEDIA.NET

дзякуючы падвышэнню пенсійнага ўзросту за час сваёй працоўнай дзейнасці яны ўнясуць у пенсійны фонд значна больш сродкаў, чым выдаткуюць. У салідарнай пенсійнай сістэме гэта з'яўляецца праблемай, бо людзі проста дораць зароблене дзяржаве.

*"Усё вышэй сказанае мае дачыненне да развітых краін, якой Беларусь, на жаль, не з'яўляецца,* – даваля эканаміст **Таццяна Зялко** падчас дыскусіі ў межах "Народнай пргграмы" (Prahrama.by). – *Паводле афіцыйнай статыстыкі, 25% насельніцтва не дажывае да свайго пенсійнага ўзросту. У выніку яго падвышэння гэтая лічба павялічыцца прынамсі на 10%. Фігуральна кажучы, больш лагічна будзе скасаваць інстытут пенсіі ўвогуле, а ля прадпрыемстваў пакінуць месца пад цвінтар".*

Аднак, пытанне падвышэння пенсійнага ўзросту з мэтай павелічэння памераў пенсій разгледзець варта, кажа спецыяліст: *"Але выключна разам з іншымі новаўвядзеннямі ў пенсійную палітыку. Можна, напрыклад, увесці выключна дазваленчы прынцып выхаду на пенсію. То бок, чалавек сам павінен вырашыць, выходзіць яму на пенсію пасля дасягнення ім пэўнага ўзросту ці не. Да таго ж, калі чалавек адмаўляецца ад выхаду на пенсію, трэба альбо адмяніць унёскі ў пенсійны фонд, альбо перагледзець прынцып выплаты заробкаў пенсіянерам, што працягваюць працаваць. Яшчэ адна мера – гэта падлік і магчымасць успадкоўвання пенсійных унёскаў".*

Акурат у часе дыскусіі "Народнай праграмы" па СТБ датычна перспектываў пенсійнай рэформы выступіла міністр працы і сацыяльнай абароны **Марыяна Шчоткіна**. Яна распавяла, што бліжэйшыя пяць гадоў пенсійны ўзрост павялічвацца не будзе, але ў выніку ад гэтага ўсё адно не падзецца.

*"Калі мы пытаем у людзей, ці трэба павялічваць пенсійны ўзрост, яны адказваюць, што трэба. Але на пытанне "Калі?" адказваюць, што калі гэта іх не будзе тычыцца. Тэарэтычна – так. Калі практычна, то лепш папазней",* – паведаміла міністр.

*"Які пенсійны ўзрост у розных краінах? Данія, Нарвегія – 67 гадоў, Іспанія, Швецыя, Фінляндыя – 65 гадоў. На Захадзе вы не знойдзеце ніводнай краіны, дзе пенсійны ўзрост жанчыны будзе менш 65 гадоў. Пра гэта кажуць. Але, зноў-такі, усё ўпіраецца ў сродкі. На колькі хопіць сродкаў, каб плаціць пенсіі ў той сістэме, якая ёсць? Сёння Украіна ўнесла змены, кажа пра гэта Расія. У доўгатэрміновай перспектыве, вядома ж, і мы нікуды не падзенемся ад гэтых тэндэнцый. Мы павінны гэта правільна ўспрымаць, таму што сёння колькасць пенсіянераў – 26% насельніцтва. Працоўныя рэсурсы паступова паменшацца, калі дэмаграфічная сітуацыя не выправіцца, а колькасць пенсіянераў узрастае",* – сказала міністр працы і сацабароны Беларусі.

# Крызіс: анекдоты і пратэст

**Трымацца ў крызіс беларусам дапамагае ў тым ліку гумар. Валютныя праблемы з беспрэцэдэнтнай дэвальвацыяй нарадзілі анекдот пра тое, што курс беларускага рубля да долара вызначаецца нумарам месяца... Яшчэ адзін анекдот: Лукашэнка паабяцаў распавесці, калі ён паабяцае наступны раз.**

Ад вясны ён, урадоўцы і нацбанкаўцы давалі народу абяцанкі, што вось-вось усё стабілізуецца. Не дзіва, што гэтая эканамічная псіхатэрапія мае адваротны эфект.

Так, пасля таго, як Лукашэнка нарэшце больш-менш канкрэтна паведаміў, што курс нацыянальнай валюты будзе адпушчаны з сярэдзіны верасня, калі будзе праведзеная дадатковая сесія таргоў на валютнай біржы, на якой можна будзе свабодна купіць і прадаць долары, еўра, расійскія рублі і іншую валюту. Але ў выніку курс долара (паводле анекдота) вырас да 9 тысяч рублёў.

Бо валюту можна будзе купіць толькі са строгім улікам па пашпарце, а на адзіны курс мяркуецца выйсці толькі праз 1-2 месяцы. Гэта значыць, нехта, хто мае доступ да валюты па курсе Нацбанку, зможа па-ранейшаму атрымліваць звышдаходы.

Давер да ўладаў мізарнее і праз рост коштаў, якія б'юць як па сямейных бюджэтах, так і па спажывецкай псіхалогіі. Разам з тым пакуль большасць беларусаў спавядаюць стратэгію выжывання, хаця сацыяльны пратэст пакрысе выспявае.

Ці гатовыя вы ўдзельнічаць у мерапрыемствах, акцыях,

*Трацiна гараджан гатовая ўдзельнічаць у акцыях пратэсту*

накіраваных на абарону вашых эканамічных інтарэсаў і інтарэсаў членаў вашай сям'і? Калі "так", то ў якіх? Такія пытанні былі зададзеныя гараджанам Беларусі сацыялагічным цэнтрам "Люстэрка-інфа" ў жніўні.

Адносная большасць апытаных – каля трацiны гараджан (34%) сказалі, што яны гатовыя падпісаць "пісьмовыя звароты, патрабаванні і просьбы да кіраўніцтва краіны, прадстаўнікам улады па паляпшэнні свайго матэрыяльнага становішча, па паляпшэнні эканамічнага становішча сваіх сем'яў».

Каля трацiны (30%) адказалі на пытанне згодныя з тым, што цяпер надта цяжка», але яны пакуль не гатовыя на нейкія дзеянні: "Трэба вычакаць, усё адновіцца".

Кожны чацвёрты гараджанін Беларусі «гатовы ўдзельнічаць у законных (дазволеных уладай) мерапрыемствах» (24%). Досыць значная частка рэспандэнтаў (12%) "гатовая ўдзельнічаць нават у незаконных (не дазволеных уладай) масавых мерапрыемствах".

Гэта значыць, кожны трэці беларус у горадзе гатовы ўдзельнічаць у акцыях пратэсту – у санкцыянаваных ці не.

Толькі кожны дзесяты гараджанін заўважыў, што ён "эканамічных, матэрыяльных праблем не адчувае" (11%).

# Мінскі Еўраклуб адкрыў бібліятэку

**1 верасня бібліятэка адкрылася для наведнікаў. Актывісты Руху заклікаюць далучацца да папаўнення кнігазбору на еўрапейскую тэматыку, які ўжо зараз складае каля сотні асобнікаў.**

Кіраўніца адукацыйных праектаў **Даша Слабчанка**, якая з'яўляецца аўтарам ідэі стварэння бібліятэкі, патлумачыла яе сэнс так:

*– На жаль, у беларускіх ВНУ пра касметычны рамонт і ідэалогію дбаюць болей, чым пра аднаўленне бібліятэк. Але веды маюць каштоўнасць, калі імі дзеляцца. Таму і створаная гэтая бібліятэка.*

Каардынаваць працу бібліятэкі Еўрапейскага клуба і займацца папаўненнем фонду будзе актывістка **Наталля Мотуз**:

*– Мы заклікаем усіх жадаючых, хто мае магчымасць наведваць Еўразвяз, прывозіць з еўрапейскіх краін для нас кнігі і дыскі. Усё, што тычыцца Аб'яднанай Еўропы. На сённяшні дзень сабрана каля сотні кніг. Іх перадалі ў фонд бібліятэкі Аляксей Янукевіч, Алесь Лагвінец, Юрась Меляшкевіч, Даша Слабчанка, Дзяніс Мельянцоў, рэдакцыя інтэрнэт-часопіса "Новая Еўропа". У нас ёсць кнігі па гісторыі, дапаможнікі для настаўнікаў, журналістаў,*



*слоўнікі, турыстычныя брашуры, лекцыі выкладчыкаў еўрапейскіх школ, шмат кніг па самакіраванню, Канвенцыя па правах чалавека, матэрыялы канферэнцый і кніжкі для дзяцей. У асноўным мы маем кнігі на англійскай, французскай, нямецкай, польскай мовах.*

Выданні бібліятэкі можна будзе браць дахаты.

Газета выдаецца Рухам "За Свабоду". Наклад 299 ас. Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі бясплатна. Падпісана ў друк 5.09.2011 г. Кантакты Рэдакцыі: тэлефон: 2808863, е-пошта: info@pyx.by